**Да 70-годдзя**
**з дня нараджэння**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Бібліятэка

*Дзеячы навукі і культуры Беларусі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Аляксандр Іванавіч СМОЛІК

Біябібліяграфічны даведнік

Мінск
БДУКМ
2014

УДК 012 Смолік А. І.+016:008
ББК 91.28+71я1
С 512

Складальнікі: Т. А. Самайлюк, Т. В. Ішуціна

**Аляксандр Іванавіч Смолік** : біябібліягр. давед. / склад.:
С 512 Т. А. Самайлюк, Т. В. Ішуціна ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, бібліятэка. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 88 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).
ISBN 978-985-522-114-3.

*Біябібліяграфічны даведнік прысвечаны беларускаму вучонаму, стваральніку айчыннай культуралагічнай школы, доктару культуралогіі, прафесару, загадчыку кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандру Іванавічу Смоліку, аўтару манаграфій, падручнікаў, артыкулаў па тэорыі, гісторыі і прыкладной культуралогіі, айчыннай гісторыі, арыгінальных распрацовак камп'ютарных вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі.*

*Даведнік змяшчае працы А. І. Смоліка з 1968 г. па 2014 г., публікацыі аб жыццёвым і творчым шляху выдатнага вучонага, дзеяча, які ўзбагачае скарбніцу беларускай культуры.*

*Навукоўцам і практыкам у галіне культуралогіі, айчыннай гісторыі, выкладчыкам, студэнтам, аспірантам; бібліятэчным работнікам і ўсім, хто цікавіцца пытаннямі прыкладной культуралогіі, гісторыі і культуры Беларусі.*

**УДК 012 Смолік А. І.+016:008**
**ББК 91.28+71я1**

**ISBN 978-985-522-114-3**

© Самайлюк Т. А., Ішуціна Т. В., складанне, 2014
© Сакалова В. М., уступны артыкул, 2014
© Афармленне. УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

Ад складальнікаў........................................................... 6

*Сакалова В. М.* Беларускі культуролаг Аляксандр Іванавіч Смолік: вытокі і здабыткі................................ 8

Даты з біяграфіі.................................................... 15

Літаратура пра А. І. Смоліка.................................. 17

Храналагічны паказальнік прац прафесара А. І. Смоліка.................................................................. 21

Дапаможныя паказальнікі

Алфавітны паказальнік прац А. І. Смоліка........... 72

Імянны паказальнік................................................ 84

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ

Біябібліяграфічны даведнік з серыі «Дзеячы навукі і культуры Беларусі» прысвечаны беларускаму вучонаму, доктару культуралогіі, прафесару, загадчыку кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў А. І. Смоліку, аўтару манаграфій, падручнікаў, артыкулаў па тэорыі, гісторыі і прыкладной культуралогіі, айчыннай гісторыі, арыгінальных распрацовак камп'ютарных вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі.

У пачатку даведніка друкуецца артыкул В. М. Сакаловай «Беларускі культуролаг Аляксандр Іванавіч Смолік: вытокі і здабыткі», у якім прасочваецца жыццёвы і творчы шлях вучонага, аналізуюцца яго працы.

Дапаўняюць артыкул рубрыкі «Даты з біяграфіі» і «Літаратура пра А. І. Смоліка», у якой матэрыял змешчаны ў храналогіі выхаду публікацый, у межах года – у алфавіце аўтараў і назваў артыкулаў.

«Храналагічны паказальнік прац прафесара А. І. Смоліка» змяшчае працы аўтара з 1968 г. па 2014 г. Бібліяграфічныя запісы групуюцца па храналогіі, а ў межах гадавой рубрыкі ў наступным парадку: асобныя выданні прац А. І. Смоліка; артыкулы, надрукаваныя ў зборніках навуковых прац, матэрыялы і тэзісы выступленняў на канферэнцыях, артыкулы ў выданнях, што прадаўжаюцца; артыкулы з часопісаў і газет; працы, якія выйшлі ў суаўтарстве; праграмы і метадычныя матэрыялы; працы пад рэдакцыяй А. І. Смоліка і працы, рэцэнзаваныя навукоўцам.

Апісанні рэцэнзій на публікацыі А. І. Смоліка змешчаны ў канцы апісанняў рэцэнзаваных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дысертацыі, выкананыя пад кіраўніцтвам вучонага, выдзелены ў асобны раздзел. Запісы прадстаўлены ў храналагічным парадку.

Бібліяграфічныя запісы ў даведніку складзены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі: ГОСТ 7.1-2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления; ГОСТ 7.80-2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления. У раздзеле «Храналагічны паказальнік прац прафесара А. І. Смоліка» загаловак апісання не выкарыстоўваецца. Скарачэнні слоў і словазлучэнняў адпавядаюць патрабаванням дзяржаўнага стандарту Рэспублікі Беларусь СТБ 7.12-2001. Бібліяграфічны запіс. Скарачэнне слоў і словазлучэнняў на беларускай мове. Агульныя патрабаванні і правілы, міждзяржаўнага стандарту ГОСТ 7.12-93. Библиографическая запись. Сокращение слов на русском языке. Общие требования и правила.

Навукова-дапаможны апарат выдання ўключае:

– алфавітны паказальнік прац А. І. Смоліка;

– імянны паказальнік (аўтараў і суаўтараў публікацый, персаналій). Нумары бібліяграфічных запісаў персаналій у імянным паказальніку пазначаны ў дужках.

Пры падрыхтоўцы даведніка былі выкарыстаны выданні дзяржаўнай бібліяграфіі Рэспублікі Беларусь, СССР, Расіі, электронныя базы даных «Працы выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў», «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў у друку», фонды, каталогі і картатэкі бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прагледжаны камплекты асобных газет, часопісаў і іншых выданняў, у якіх маглі знаходзіцца матэрыялы аб А. І. Смоліку.

Публікацыі, уключаныя ў даведнік, прагледжаны de visu, за выключэннем выданняў, пазначаных астэрыскам *.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКІ КУЛЬТУРОЛАГ АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ СМОЛІК: ВЫТОКІ І ЗДАБЫТКІ

Заснавальнік беларускай культуралагічнай школы Аляксандр Іванавіч Смолік нарадзіўся ў 1944 г. у вёсцы Каловічы Вілейскага раёна, дзе і правёў дзяцінства. Вёска заўсёды давала кадры беларускай культуры: вядомых у свеце пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў, вучоных, палітыкаў і грамадскіх дзеячаў. У вёсцы нарадзілася любоў будучага доктара культуралогіі да культуры, мастацтва, да Беларусі.

Юнак імкнуўся спасцігнуць таямніцы гісторыі краіны, яе самабытнай, багатай культуры, што і прывяло яго на гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага.

Студэнцкае жыццё было напоўнена інтэлектуальнай працай. Акрамя лекцыйных і практычных заняткаў Аляксандр шмат працуе самастойна. Гэтаму спрыяла блізкае знаходжанне ад інтэрната Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, у якой студэнт праводзіў увесь вольны час. Ужо на першым курсе ім была падрыхтавана цікавая навуковая праца, прысвечаная культуры шумера-акадскай цывілізацыі. Са студэнцкімі навуковымі дакладамі А. Смолік выступаў на канферэнцыях у Ленінградзе, Каўнасе, Кіеве. Зборнікі тэзісаў згаданых канферэнцый прафесар захоўвае да гэтага часу. Інстытуцкае жыццё было азначана не толькі ўпартай вучобай, у гэты перыяд ярка праявіліся і яго арганізацыйныя здольнасці. Студэнцкая моладзь выбірае Аляксандра камсоргам гістарычнага факультэта, а ў 1969 г. сакратаром камітэта камсамола з правамі райкама інстытута. Пяць гадоў ён узначальваў адну з лепшых камсамольскіх арганізацый ВНУ. Адметнай рысай лідара студэнцкай моладзі з’яўляецца ўменне ў бурлівай і імклівай камсамольскай дзейнасці знахо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзіць час для навуковай працы. Рэдкія вольныя вечары і выхадныя дні аддае рабоце над кандыдацкай дысертацыяй, якую паспяхова абараняе ў 1972 г. Праз год малады кандыдат гістарычных навук пераходзіць на навукова-педагагічную работу.

За 20 гадоў выкладчыцкай працы А. І. Смолік прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта кафедры навуковага камунізму. Адначасова рэалізоўваўся талент адміністратара – ад загадчыка падрыхтоўчага аддзялення да дэкана факультэта падрыхтоўкі да паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі і прафесійнай арыентацыі моладзі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1979–1992).

Дванаццаць гадоў (1992–2004) Аляксандр Іванавіч шчыраваў на ніве культуры на пасадзе прарэктара па вучэбнай рабоце Мінскага інстытута культуры. З 2004 г. па 2006 г. А. І. Смолік – першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Арганізацыйна-педагагічную працу ўмела спалучаў з рознабаковай навуковай дзейнасцю, што дазволіла яму абараніць першую ў Беларусі доктарскую дысертацыю па тэорыі і гісторыі культуры (1999). А. І. Смолік першым у Беларусі распрацаваў метадалогію культуралагічнага даследавання сацыякультурных з'яў і працэсаў, якія адбываліся ў постсавецкі перыяд.

Навуковы аўтарытэт Аляксандра Іванавіча садзейнічаў адкрыццю ў 2001 г. савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры, які ён узначальваў шэраг гадоў. Сёння А. І. Смолік з'яўляецца намеснікам старшыні аб'яднанага савета па абароне доктарскіх дысертацый па тэорыі і гісторыі культуры і тэорыі і гісторыі мастацтва. За 13 гадоў існавання савета ў ім абаронена больш за 40 дысертацый па праблемах фундаментальнай культуралогіі. Такі вынік працы дазваляе адзначыць высокі прафесіянальны ўзровень зачынальніка беларускай культуралагічнай школы.

Як прарэктар па вучэбнай рабоце, а затым першы прарэктар А. І. Смолік стаяў ля вытокаў структурных пераўтварэнняў ва ўніверсітэце. Пры яго непасрэдным удзеле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі створаны новыя факультэты, кафедры, а Мінскі інстытут культуры быў пераўтвораны спачатку ў Беларускі ўніверсітэт культуры, затым атрымаў статус вядучай установы ў сваёй галіне адукацыі, а ў 2004 г. стаў Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Дзякуючы намаганням Аляксандра Іванавіча з 2003 г. ва ўніверсітэце праводзіцца набор на спецыяльнасць «тэорыя і гісторыя культуры».

З 2006 г. Аляксандр Іванавіч Смолік узначальваў кафедру гісторыі Беларусі і музеязнаўства, а з 2009 г. – кафедру культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У 2006 г. узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». У 2008 г. атрымаў персанальную надбаўку за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.

А. І. Смолік з'яўляецца адным з заснавальнікаў і кіраўніком навуковай школы ў галіне культуралогіі «Тэорыя і гісторыя культуры», якая функцыянуе пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Інтэлектуальнае ядро школы складаюць яго вучні, што працуюць у шэрагу УВА.

Здабыткі маладой нацыянальнай культуралагічнай школы ўнушальныя: 41 абароненая дысертацыя, з якіх 4 доктарскіх і 37 кандыдацкіх дысертацый.

Аляксандр Іванавіч паспяхова прадстаўляў беларускую школу культуролагаў на нарадзе-семінары загадчыкаў кафедр культуралогіі краін СНД, якая адбылася ў Санкт-Пецярбургу (2014).

Прафесар А. І. Смолік чытае ўнікальныя аўтарскія курсы «Культуралагічная адукацыя», «Прыкладная культуралогія», «Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі» на факультэце культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, арыгінальныя курсы лекцый «Музей як форма рэпрэзентацыі культуры», «Жанчыны ў сацыякультурным жыцці беларускага грамадства».

Галіной яго сучаснай навуковай дзейнасці з'яўляецца выяўленне месца, ролі, функцый і тэндэнцый айчыннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

элітарнай культуры ў кантэксце масавізацыі і глабалізацыі культурнай прасторы беларускага грамадства.

Вынік навукова-тэарэтычнай і практычнай дзейнасці даследчыка культуры – шэраг падручнікаў і манаграфій, арганізацыя міжнародных канферэнцый і складанне навуковых выданняў. Аляксандр Іванавіч – старшыня навуковага савета навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў».

А. І. Смолік – заснавальнік серыі «Культурны імідж Беларусі» (2013). У серыі выйшлі манаграфіі, прысвечаныя праблемам гуманітарнай адукацыі, фундаментальнае даследаванне па культуралогіі, а таксама манаграфічны зборнік па выніках міжнароднай канферэнцыі Беларусі і Літвы, арганізаванай А. І. Смолікам. Гэтая праца – вынік сямігадовых, распачатых Аляксандрам Іванавічам даследаванняў роду Тышкевічаў.

Сфера навуковых прыярытэтаў А. І. Смоліка – вывучэнне праблем сутнасці, зместу, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў у посткатастрофным соцыуме, рэабілітацыйна-катарсіснае ўздзеянне мастацтва на асобу, асэнсаванне праблем дынамікі беларускай культуры ў кантэксце гуманітарных і тэхнагенных катастроф, змяненняў або мадыфікацый пэўных рыс беларускай нацыянальнай культуры ў прасторы і часе.

Даследаванню праблем постчарнобыльскага соцыуму прысвечаны манаграфія «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» (1999), вучэбны дапаможнік «Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме» (1999). У манаграфіі на аснове структурнага аналізу А. І. Смолікам вызначана сацыядынаміка сучаснай беларускай культуры. На погляд вучонага, у 1980-х гг. у беларускім грамадстве пачаліся буйнамаштабныя і доўгатэрміновыя працэсы дынамічных сацыяльна-культурных змен, выкліканыя неабходнасцю адаптацыі да знешніх фактараў і вырашэння ўнутраных праблем. Мадэрнізацыйныя працэсы, якія адбываюцца сёння, уцягваюць беларускае грамадства ў сацыякультурную прастору заходніх краін у выніку хуткага развіцця камунікатыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных сувязей, дыфузных міжнацыянальных працэсаў, павелічэння міграцыі народаў, узаемапранікнення і зліцця культур. Да фактару макрамаштабнай сацыякультурнай дынамікі культуролаг адносіць таксама негатыўныя наступствы тэхнагеннай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. А. І. Смолік распрацаваў канцэпцыю рэабілітацыйна-катарсіснага ўздзеяння мастацтва на дэзадаптаваную асобу посткатастрофнага соцыуму, якая паспяхова выкарыстоўваецца шэрагам сацыякультурных устаноў краіны.

Праца «Гісторыя і культура беларускіх татар» (2000; разам з І. Б. Канапацкім) прысвечана даследаванню працэсу разгортвання культуры беларусаў і татар у часе і прасторы ва ўзаемасувязі з сацыяльна-палітычнай арганізацыяй, сацыяльнымі ўзрушэннямі беларускага грамадства.

Побач з даследаваннем праблем фундаментальнай культуралогіі А. І. Смолік займаецца вывучэннем пэўных аспектаў прыкладной культуралогіі. Так, у суаўтарстве з Я. Д. Грыгаровіч ім падрыхтавана першая ў Беларусі комплексная праца «Прыкладная культуралогія» (2005), дзе акрэслены праблемы тэорыі і метадыкі інстытуцыянальных і пазаінстытуцыянальных узаемаадносін суб’ектаў культуры, формы і тэхналогіі фарміравання культуры асобы. Раскрываюцца асновы культурнай палітыкі, яе прынцыпы і мэты, аналізуюцца функцыі сацыякультурных інстытутаў па засваенні культуры індывідам і рознымі сацыяльнымі групамі.

У асобе А. І. Смоліка спалучаюцца два сапраўдныя таленты: арганізацыйныя здольнасці і вялікая любоў да Радзімы. Ён з’яўляецца арганізатарам, ініцыятарам і натхняльнікам правядзення міжнародных канферэнцый, складальнікам навуковых выданняў – «Тышкевіцкія чытанні», «Кандрацьеўскія чытанні».

Па ініцыятыве прафесара А. І. Смоліка ў 2008 г. засноўваюцца Тышкевіцкія чытанні, ва ўніверсітэце ствараецца мемарыяльная аўдыторыя ў гонар Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, што абуджае цікавасць моладзі да знакамітых заснавальнікаў беларускага музеязнаўства і археалогіі. У аўдыторыі чытаюцца лекцыі і адбываюцца канфе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэнцыі для студэнтаў спецыяльнасці «музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры». У 2014 г. па прапанове А. І. Смоліка чытанні прайшлі ў Палацы Тышкевічаў у Крэцінзе (Літва). Традыцыйная навуковая імпрэза набыла статус міжнароднай. Плануюцца Другія Кандрацьеўскія чытанні ў Маскве ў 2015 г.

У цыкле навуковых прац і артыкулаў А. Смоліка ўсебакова разгледжана культуратворчая дзейнасць беларускіх мысліцеляў мінулых стагоддзяў («Культура Беларусі XI–XIX стст.», 1998). Ім вернута з імглы забыцця імя І. К. Кандрацьева, беларуса па паходжанні, таленавітага паэта, празаіка, драматурга, гісторыка, перакладчыка, педагога (манаграфія «Божы дар Івана Кандрацьева», 2013). Аляксандр Іванавіч шчыра аддзячыў сваёй бацькаўшчыне: змог прыцягнуць увагу грамадства да маленькай вёсачкі, падараваўшы аднавяскоўцам славутага земляка, вядомага пісьменніка, чый талент апавядальніка параўноўвалі з Гюго. З вёскай Каловічы звязана жыццё І. К. Кандрацьева (1849–1904), творчасць якога адкрыў для беларусаў А. І. Смолік. Разам з вілейскімі краязнаўцамі ім ажыццёўлены імпрэзы на малой Радзіме пісьменніка, арганізаваны Кандрацьеўскія чытанні. На свята ў Вілейцы сабраліся аднавяскоўцы і шчыра дзякавалі Шурыку, так ласкава называючы яго па старой памяці, за ўвагу да іх. Асобныя артыкулы прысвечаны паказу шматграннай дзейнасці знакамітых беларускіх дзеячаў І. А. Гашкевіча, Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, А. М. Янушкевіча, Міхаіла Гузікава, Саламеі Русецкай і інш.

Галоўнай справай апошніх гадоў навуковай дзейнасці Аляксандра Іванавіча стала абагульненне тэарэтыка-метадалагічнай дзейнасці беларускіх вучоных па фарміраванні імпліцытных і экспліцытных ведаў аб культуры ад XII ст. да сучаснасці. У манаграфіі «Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць» (2014) абагульняецца шматаспектная навукова-тэарэтычная дзейнасць беларускіх вучоных па выяўленні і даследаванні фундаментальных і прыкладных праблем нацыянальнай культуры. Даецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэмны аналіз сучаснага этапу культурагенезу ў кантэксце дынамікі беларускай культуры.

А. І. Смолік знаходзіўся ля вытокаў айчыннай культуралагічнай адукацыі, непасрэдна ўдзельнічаў у распрацоўцы адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і праграм для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па культуралагічных спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Ім распрацаваны і выдадзены вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў «Культуралогія: тэорыя культуры» (2008; разам з Л. К. Кухто), «Культуралогія: гісторыя культуры» (2009; разам з Л. К. Кухто і А. А. Цобкалам). Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара А. І. Смоліка беларускімі даследчыкамі абаронены магістарскія, кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Вучні і калегі, сын і нявестка (Дзяніс Аляксандравіч Смолік і Людміла Канстанцінаўна Кухто – кандыдаты культуралогіі), унукі і жонка падтрымліваюць і падзяляюць з Аляксандрам Іванавічам агульныя інтарэсы, любоў да ведаў, культуры Беларусі.

Жывое, істотнае і грунтоўнае ў культуры нараджаецца з душы чалавека. Яно лёгка ўсплывае з глыбіні сэрца і складваецца ў радкі. Любоў да жыцця і рамантычны настрой жывуць у душы Аляксандра Іванавіча. К. Паўстоўскі пісаў, што рамантычнасць уласціва навуцы і пазнанню, і чым болей ведае чалавек, тым паўней ён успрымае рэчаіснасць і тым ён шчаслівейшы. Сапраўднае шчасце – доля тых, хто валодае ведамі, дасведчаных, тых, хто шукае, і летуценнікаў. У асобе А. І. Смоліка спалучаюцца носьбіт ведаў, транслятар ідэй, таленавіты наратар і шчаслівы чалавек, летуценнік, які марыць аб тым, каб усе разумелі яго, паверылі яму, які ўзбагачае скарбніцу беларускай культуры, спяшаецца сказаць людзям усё, што ведае, усе думкі, сілу якіх адчувае.

Труды Аляксандра Іванавіча Смоліка актуальныя, своечасовыя і неабходныя сучаснаму беларускаму грамадству ў час пошуку духоўнасці, пошуку сваіх каранёў.

*В. М. Сакалова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАТЫ З БІЯГРАФІІ

| | |
|---|---|
| **1944**, 24 кастрычніка | нарадзіўся ў в. Каловічы Вілейскага раёна Мінскай вобласці |
| **1957** | скончыў Цынцавіцкую сямігадовую школу ў Вілейскім раёне |
| **1959** | паступіў у СШ № 1 г. Вілейкі |
| **1962** | скончыў СШ № 1 г. Вілейкі |
| **1964** | паступіў у Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага |
| **1967** | узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За лучшую научную студенческую работу» |
| **1968** | скончыў на выдатна гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |
| **1969** | абраны сакратаром камітэта камсамола з правамі райкама Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |
| **1970** | узнагароджаны медалём «За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В. И. Ленина» |
| **1971** | узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР |
| **1972** | абаронена дысертацыя на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук |
| **1972** | ст. выкладчык Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| **1977** | дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |
| **1978** | прысвоена вучонае званне дацэнта навуковага камунізму |
| **1978** | скончыў дзесяцімесячныя курсы замежных моў у Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Т. Шаўчэнкі |
| **1979** | загадчык падрыхтоўчага аддзялення Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |
| **1981** | узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» |
| **1989** | дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага |
| **1992** | прарэктар па вучэбнай рабоце Мінскага інстытута культуры |
| **1999** | прысвоена вучонае званне прафесара па спецыяльнасці «гісторыя» |
| **1999** | абаронена дысертацыя на саісканне вучонага звання доктара культуралогіі |
| **2004** | першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў |
| **2006** | загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў |
| **2006** | узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» |
| **2009** | загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА
## ПРА А. І. СМОЛІКА

**Смолік Аляксандр Іванавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 59.

**Смолік Аляксандр Іванавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 438. – Бібліягр. у канцы арт.

**Смолік Аляксандр Іванавіч** // Памяць. Вілейс. раён. – Мінск, 2003. – С. 575–576. – (Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі).

**Смолік Аляксандр Іванавіч** / Э. Дубянецкі // Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. Дубянецкі. – Мінск, 2003. – С. 304.

**Смолик Александр Иванович** // Республика Беларусь : энцикл. : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – Т. 6. – С. 736–737.

* * *

**Аб** складзе экспертнай камісіі [па конкурсных праектах праграм рэалізацыі прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай культурнай палітыкі]: Загад М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 01.08.1997, № 224 // Асноўныя службовыя дакументы / Нац. б-ка. Беларусі. – Мінск, 1998. – 2-е паўгод. 1997 г. – С.72–77. – Прарэктар Беларус. ун-та культуры *А. І. Смолік* у Складзе экспертнай камісіі (с. 73) і ў Складзе секцыі па мастацкай адукацыі і кадрах (с. 76).

**Протько, Ю. Д.** Методические мультимедийные продукты в системе культурологического образования : [опыт каф. информ. технологий в культуре БУК. Упоминается мультимед. комплекс «Культура Беларуси», соз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

данный под рук. проф. *А. И. Смолика*] / Ю. Д. Протько // Выш. шк. – 1999. – № 3/4. – С. 103–104.

**Прэзідыум** Дзяржаўнага вышэйшага атэстацыйнага камітэта Рэспублікі Беларусь прысвоіў вучонае званне прафесар наступным асобам: ... *Смоліку Аляксандру Іванавічу* : [па спецыяльнасці «Гісторыя» (п-ва ад 23 чэрв. 1999 г. № 17П (пратакол № 11/6)] // Атэстацыя навук. і навук.-пед. кадраў выш. кваліфікацыі. – 1999. – № 3. – С. 74.

**Аннотации** диссертаций, рекомендованные к публикации президиумом ВАК Беларуси : дис. на соиск. учен. степ. д-ра наук : [в т.ч.: *Смолик А. И.* «Деятельность социально-культурных институтов в посткатастрофном социуме»] // Атэстацыя навук. і навук.-пед. кадраў выш. кваліфікацыі. – 2000. – № 2. – С. 49–51.

**Гаравы, М.** Прэзентацыя кнігі [Канапацкага І. Б., *Смоліка А. І.*] «Гісторыя і культура беларускіх татар» [Мінск, 2000] адбылася ва ўніверсітэце культуры / М. Гаравы // Нар. воля. – 2000. – 22 верас.

**Доўнар, Л.** Успамін пра Міколу Грынчыка : [пра вечарыну, прысвеч. памяці былога заг. каф. беларус. мовы і літ. БУК праф. М. Грынчыка (12 кастр. 2000 г.). З успамінамі выступіў у т.л. *А. І. Смолік*] / Л. Доўнар // Літ. і мастацтва. – 2000. – 27 кастр. (№ 43). – С. 14.

**Доўнар, Л.** Блаславёнае слова : [прэзентацыя кн. І. Б. Канапацкага і А. І. Смоліка «Гісторыя і культура беларускіх татар» (Мінск, 2000) у б-цы БУК] / Л. Доўнар // Наша слова. – 2000. – 4 кастр.

**Марадудина, Н.** Когда специалисты на вес золота : [проблема обеспеченности кадрами учреждений культуры Респ. Беларусь и подготовка специалистов в БУК. Встреча ректората БУК, в т.ч. *А. И. Смолика,* с журналистами в Нац. пресс-центре] / Н. Марадудина // Веч. Минск. – 2000. – 8 июня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**На** скрыжаванні прасторы і часу : [інфарм. аб прэзентацыі кніг рэктара Беларус. дзярж. акад. мастацтваў Р. Смольскага «Тэатр у прасторы часу» і «На скрыжаванні» (5 крас. 2000 г., чыт. зала БУК). Таксама пра выступленне і ўдзел у мерапрыемстве *А. І. Смоліка*] // Культура. – 2000. – 8–14 крас. (№ 14). – С. 3.

**Сведения** о диссертациях, по которым ВАК Беларуси приняты положительные решения (I квартал 2000 г.) : дис. на соиск. учен. степ. д-ра наук : [в содерж.: о присуждении 17.03.2000 г. учен. степ. д-ра культурологии по специальности 24.00.01 – теория культуры *Смолику А. И.* за выполненную и защищенную в БУК дис. «Дзейнасць сацыяльна-культурных інстытутаў Беларусі ў посткатастрофным соцыуме». Здесь же дана характеристика дис. (текст на белорус. яз.)] // Атэстацыя навук. і навук.-пед. кадраў выш. кваліфікацыі. – 2000. – № 2. – С. 27–28.

**Кірпічэнкава, Н.** «Віват», «Валачобнікі», «Грамніцы»... : [пра справаздачны за 2001–2002 навуч. год канцэрт студ. БДУК. Таксама размова з прарэктарам *А. Смолікам*] / Н. Кірпічэнкава ; фота Г. Жынкова // Культура. – 2002. – 8–14 чэрв. (№ 22). – С. 16. – (Замест кропкі).

**Русак, Н.** Спецыялістаў не хапае, але, часам, ад іх адмаўляюцца... : Ун-т культуры ўводзіць новыя спецыялізацыі : [па матэрыялах гутаркі з прарэктарам БДУК *А. І. Смолікам*] / Н. Русак // Культура. – 2003. – 28 чэрв. – 4 ліп. (№ 26). – С. 4.

**Смолик, А. И.** Как развивается в Республике Беларусь наука о культуре? : [в т.ч. о роли в разработке теории и истории культуры трудов ученых БГУК : Г. И. Барышева, Ю. М. Чурко, *А. И. Смолика* и др.] / А. И. Смолик // Белорусская культура: вопросы и ответы / Белорус. гос. ин-т проблем культуры. – Минск, 2003. – Ч. 1. – С. 31–36.

**Цюркалогія** : [у арт. сярод даследчыкаў гісторыі і культуры беларус. татар называецца таксама выкладчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БДУК *А. І. Смолік*] // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2003. – Т. 17. – С. 188.

**Голін, Д.** У гонар славянскіх апосталаў : [у т.л. аб удзеле першага прарэктара БДУК *А. Смоліка* ў прэс-канф. «24 мая – Дзень славянскага пісьменства і культуры», якая адбылася ў Нац. прэс-цэнтры] / Д. Голін // Культура. – 2004. – 22–28 мая (№ 21).– С. 2.

**Кавалёў, В.** Свята славянскага пісьменства і культуры : [агляд прэс-канф. «24 мая – Дзень славянскага пісьменства і культуры», якая адбылася ў Нац. прэс-цэнтры. У т. л. фрагмент выступлення першага прарэктара *А. І. Смоліка* пра мерапрыемствы, падрыхтаваныя БДУК у рамках правядзення свята] / В. Кавалёў // Літ. і мастацтва. – 2004. – 28 мая (№ 22). – С. 2.

**Ляўковіч, А.** Кірылу, Мяфодзію і ўсім славянам прысвячаецца... : [у т.л. аб удзеле першага прарэктара БДУК *А. Смоліка* ў прэс-канф. «24 мая – Дзень славянскага пісьменства і культуры», якая адбылася ў Нац. прэс-цэнтры] / А. Ляўковіч // Звязда. – 2004. – 22 мая (№ 126). – С. 2.

**Аляксандр Іванавіч Смолік** : бібліягр. паказ. / [склад.: І. П. Кажура, Т. А. Самайлюк, І. А. Дрожжынава ; уступ. арт. М. А. Бяспалая]. – Мінск, 2005. – 35, [2] с. : партр. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Кучерова, М.** Подростки ищут свое место : [рассуждения в конф.-зале, в т.ч. с участием *А. И. Смолика*, о том, как работать с «неформатными» тусовками молодежи] / Мария Кучерова // Сов. Белоруссия. – 2012. – 19 апр. (№ 74). – С. 6 : фото. – (Конференц-зал).

**Сапоцька, П.** Да Марка Шагала ў Віцебск : [краязнаўчая экспедыцыя студ. кафедры культуралогіі на чале з праф. А. Смолікам] / Павел Сапоцька ; фот. Алены Спірынай // Краязнаўчая газета. – 2013. – Снеж. (№ 45). – С. 4. – (Дзе варта пабываць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ХРАНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ПРАЦ ПРАФЕСАРА А. І. СМОЛІКА

## 1968

***1.*** **Комсомольцы** и пионеры Белоруссии в тылу врага (1941–1944 гг.) / А. Смолик // Материалы докл. XIV юбилейной студ. науч.-техн. конф. вузов республик Прибалтики, Белорусской ССР и Калининградской области, посвящ. 50-летию ВЛКСМ, 9–14 апр. 1968 г. : обществ. науки / Каунас. политехн. ин-т. – Каунас, 1968. – С. 11.

***2.*** **Комсомольцы** и пионеры Белоруссии в тылу врага (1941–1944 гг.) / А. Смолик // Молодые – Октябрю : тез. науч. докл. студ. – участников респ. конф. по проблемам обществ. наук, истории ВЛКСМ и междунар. молодеж. движения, посвящ. 50-летию Великой Октябрьской соц. революции / М-во высш. и сред. спец. образования БССР. – Минск, 1968. – С. 185–194. – Библиогр. в подстроч. примеч.

## 1969

***3.*** **Экспедыцыя** ў сацыялогію : [аб рабоце сацыялагічнай групы Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага] / А. Смолік // Чырвоная змена. – 1969. – 9 студз.

## 1970

***4.*** **В. И. Ленин** о месте и роли студенческой молодежи в революционном процессе / А. Смолик // Проблемы общественных наук : (материалы XIII конф. молодых ученых Белоруссии) / АН БССР, Отд-ние обществ. наук. – Минск, 1970. – С. 145–150. – Библиогр. в подстроч. примеч.

***5.*** **Выконваем** двухгодку «Камсамол – сельскай школе» : [шэфская работа камсамол. арг. Мін. дзярж. пед.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ін-та імя А.М. Горкага] / А. Смолік // Нар. асвета. – 1970. – № 8. – С. 18–23 : фот.

***6.*** **С** помощью старших товарищей : [о работе комсомол. орг. Мин. гос. пед. ин-та им. А. М. Горького] / А. Смолик // Коммунист Белоруссии. – 1970. – № 8. – С. 27–30.

***7.*** **Пятизвездная** эстафета : [об агитац. походе студентов Мин. гос. пед. ин-та им. А. М. Горького по местам боевой и трудовой славы] / Н. Плескацевич, А. Смолик // Блокнот агитатора. – 1970. – № 10. – С. 22–23.

**1971**

***8.*** **Деятельность** комсомольских организаций вузов Белоруссии по подготовке студентов к воспитательной работе в школе / А. Смолик // Подготовка студентов к воспитательной работе в школе : (тез. межвуз. конф.) / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького, Лаб. проблем высш. пед. образования Ин-та общ. педагогики АПН СССР. – Минск, 1971. – С. 314–316.

**1972**

***9.*** **Совершенствование** форм и методов работы комсомольских организаций вузов Белоруссии по коммунистическому воспитанию студенческой молодежи (1966–1970 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : (07.571) / А. И. Смолик ; Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1972. – 24 с.

***10.*** **Деятельность** комсомольских организаций вузов республики по интернациональному воспитанию студенческой молодежи / А. Смолик // Вопросы истории : материалы науч. конф., 5–11 апр. 1972 г., [Минск] / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1972. – С. 54–56.

***11.*** **Совершенствование** форм и методов партийного руководства комсомольскими организациями вузов республики / А. Смолик // 50 лет комсомолу Беларуси : (материалы респ. науч. конф., посвящ. 50-летию ЛКСМБ, 22–23 окт. 1970 г., Минск) / ЦК ЛКСМБ. – Минск, 1972. – С. 319–323. – Библиогр. в подстроч. примеч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***12.*** **Однажды** – и на всю жизнь : [к 50-летию Мин. гос. пед. ин-та им. А. М. Горького] / А. Смолик // Знамя юности. – 1972. – 19 нояб.

***13.*** **Тут** вучацца настаўнікі : [да 50-годдзя Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага] / А. Смолік // Чырвоная змена. – 1972. – 21 лістап.

**1973**

***14.*** **Наука** убеждать – наука побеждать : [о подгот. в Мин. гос. пед. ин-те им. А. М. Горького студентов-лекторов, о привлечении будущих молодых специалистов к пропагандистской работе] / А. Смолик // Знамя юности. – 1973. – 14 марта.

***15.*** **Побач** старэйшы таварыш : [пра шэфства студ. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага над школьнікамі па здачы норм фізіч. падрыхт. ГПА] / А. Смолік // Чырвоная змена. – 1973. – 13 лют.

***16.*** **Заветам** Ленина верны : материал в помощь лектору / Л. А. Шульга, А. И. Смолик ; Правл. о-ва «Знание» БССР. – Минск, 1973. – 20 с. – Библиогр.: с. 19–20 (8 назв.).

**1974**

***17.*** **Формы** и методы работы комсомольских организаций вузов БССР по коммунистическому воспитанию студенческой молодежи / [материал подгот. А. И. Смолик]. – Москва, 1974. – 36 с. – (Коммунистическое воспитание студенческой молодежи : экспресс–информ. / Информ. центр высш. шк.). – Библиогр.: с. 36 (7 назв.).

***18.*** **Международные** связи института / А. И. Смолик // Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный педагогический институт имени А. М. Горького (1922–1972) : [ист. очерк]. – Минск, 1974. – Гл. 6. – С. 333–341.

***19.*** **Совершенствование** форм и методов работы комсомольских организаций вузов Белоруссии по трудовому воспитанию студентов / А. И. Смолик // Труд как важнейший фактор формирования нового человека : тез.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

докл. и выступл. на Всесоюз. науч. конф., 26–29 марта 1974 г. / Киев. гос. ун-т им. Т. Г. Шевченко. – Киев, 1974. – С. 273–275.

***20.* Работа** кафедр общественных наук и комсомольских организаций вузов Белоруссии по формированию у студентов научного мировоззрения / А. И. Смолик, Н. К. Соколов // Преподавание истории КПСС и марксистско-ленинской философии: вопросы коммунистического воспитания : сб. ст. / М-во высш. и сред. спец. образования БССР, Отд-ние преподавания обществ. наук. – Минск, 1974. – С. 111–120 : табл. – Библиогр. в подстроч. примеч.

**1975**

***21.* Пропаганда** героических боевых и трудовых подвигов советского народа – важнейшее направление работы комсомольских организаций вузов БССР по военно-патриотическому воспитанию студенческой молодежи / А. И. Смолик // Материалы науч.-теорет. конф. молодых ученых / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1975. – С. 78–82.

***22.* Другая** прафесія – грамадская : [аб рабоце фак. грамад. прафесій Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1975. – 22 кастр.

**1976**

***23.* Нужны** координация и обмен опытом : [деятельность школ молодого лектора вузов Белоруссии и проблема совершенствования подготовки студентов к пропагандистской деятельности] / А. И. Смолик // Слово лектора. – 1976. – № 9. – С. 57–60.

***24.* Из** опыта работы по подготовке лекторских кадров в Витебском ветеринарном институте : (материал в помощь рук. и препод. школ молодого лектора) / А. И. Смолик, И. Е. Семенченко ; Правл. о-ва «Знание» БССР. – Минск, 1976. – 20 с. + Прил. – Библиогр.: с. 20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1977

***25.*** **Ад** аналізу – да дзеянняў : [аб разыходж. паміж шк. ацэнкамі абітурыентаў і атрым. на ўступ. экз. у Мін. дзярж. пед. ін-це імя А. М. Горкага] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1977. – 19 сак.

## 1978

***26.*** **Некоторые** вопросы методики организации занятий в школе молодого лектора / А. И. Смолик // Совершенствование учебно-воспитательного процесса в педагогических институтах : сб. науч. тр. / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1978. – С. 129–137.

## 1979

***27.*** ***Формы** работы – разнообразные : [ко дню выборов в Верховный Совет СССР] / А. И. Смолик // Вечерний Минск. – 1979. – 17 февр.

## 1980

***28.*** **Молодежь** планеты в борьбе за мир : (материал в помощь лектору) / А. И. Смолик ; Правл. о-ва «Знание» БССР. – Минск, 1980. – 22 с. – Библиогр.: с. 22 (10 назв.).

## 1981

***29.*** **Примерная** учебная программа подготовки лекторов по проблемам истории ВЛКСМ в школе молодого лектора / Правл. о-ва «Знание» БССР ; [сост.: А. И. Смолик]. – Минск, 1981. – 26 с. – Библиогр.: с. 20–26.

***30.*** **Захапіць** рамантыкай прафесіі : [з вопыту работы падрыхт. аддз. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1981. – 12 верас.

***31.*** ***Изучение** партийных документов в курсе научного коммунизма / [среди авт. А. И. Смолик] ; Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1981.– 83 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1982

***32*. Как** наше слово отзовется... : размышления об «узких местах» в работе школ молодого лектора / А. И. Смолик // Знамя юности. – 1982. – 4 февр.

## 1983

***33*. Обучению** и воспитанию – профессиональную направленность : [опыт работы подгот. отд-ния Мин. гос. пед. ин-та им. А. М. Горького] / А. А. Луцевич, А. И. Смолик // Педагогика : респ. межвед. науч. сб. / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1983. – Вып. 22 : Методика преподавания физики. – С. 40–46.

## 1984

***34*. Хто** прыйдзе ў педінстытут : [гутарка з сакратаром прыём. каміс. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага А. І. Смолікам] / запісала Л. Бялкоўская // Настаўн. газ. – 1984. – 25 ліп.

## 1986

***35*. Подготовка** учителя к воспитанию на уроках обществоведения творческого отношения учащихся к труду / А. И. Смолик // XXVII съезд КПСС и актуальные проблемы совершенствования подготовки учительских кадров : [сб. ст.] / Вильнюс. гос. пед. ин-т, Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Вильнюс, 1986. – С. 126–128.

***36*. Формирование** у учащихся классового подхода к явлениям общественной жизни / А. И. Смолик // Формирование идейно-нравственной зрелости школьников : сб. науч. тр. / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1986. – С. 28–39. – Библиогр. в подстроч. примеч.

***37*. Формирование** у студентов классового сознания в процессе преподавания научного коммунизма / А. И. Смолик // Методические вопросы изучения материалов XXVII съезда КПСС в курсах общественных наук : тез. докл. и выступл. межвуз. науч.-метод. конф. (18 июня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1986 г., [Минск]) / А. И. Смолик, И. В. Тыщик ; ИПК препод. обществ. наук при Белгосуниверситете им. В. И. Ленина. – Минск, 1986. – С. 163–164.

**1987**

***38.*** **Методика** формирования у студентов классового подхода к явлениям общественной жизни : метод. рек. / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького ; [сост. А. И. Смолик]. – Минск, 1987. – 22 с. – Библиогр.: с. 20.

***39.*** **Из** опыта работы по подготовке молодых лекторов по проблемам научного атеизма в высших учебных заведениях Гродно / А. И. Смолик // Лекционная пропаганда: опыт и проблемы перестройки : (из практики работы организаций о-ва «Знание» респ. по соверш. лекционной пропаганды) / Правл. о-ва «Знание» БССР. – Минск, 1987. – С. 8–13.

***40.*** **Как** повысить эффективность : [анализ работы шк. молодого лектора о-ва «Знание» БССР] / И. Канапацкий, А. Смолик // Слово лектора. – 1987. – № 12. – С. 44–46.

**1988**

***41.*** **Кто** в учителя идет : [о профориент. работе Мин. гос. пед. ин-та им. А. М. Горького] / А. И. Смолик // Сов. Белоруссия. – 1988. – 25 авг.

***42.*** **Освобождаться** от догм и стереотипов : [взгляд обществоведа на теорию соц. и марксизма-ленинизма] / А. И. Смолик // Сов. Белоруссия. – 1988. – 19 июня.

**1989**

***43.*** **Формирование** у учащихся на уроках обществоведения социалистической дисциплины труда / А. И. Смолик // Формирование творческой личности в процессе обучения : материалы респ. науч.-практ. конф. : сб. науч. ст. / Респ. совет пед. о-ва БССР, Мозыр. гос. пед. ин-т им. Н. К. Крупской, Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Мозырь, 1989. – С. 63–66.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***44.*** **І** дыпламат, і рэкламны агент : [аб рабоце праф-саюз. арг. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А.М. Горкага] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1989. – 23 верас.

***45.*** **Выкарыстанне** катэгорый і тэрмінаў грамадскіх навук пры вывучэнні гісторыі КПСС і навуковага камунізму : метад. рэк. / Мін. дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага ; [склад.: І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік, Л. Л. Шкуцько]. – Мінск, 1989. – 40 с.

***46.*** **Катэгорыі** і тэрміны грамадскіх навук, іх выкарыстанне пры вывучэнні гісторыі КПСС і навуковага камунізму : вучэб.-метад. дапам. / М-ва нар. адукацыі БССР ; [склалі: І. Б. Канапацкі, В. Ф. Кушнер, А. І. Смолік, Л. Л. Шкуцько]. – Мінск, 1989. – 82 с.

***47.*** **Подготовка** молодых лекторов в ШМЛ вузов республики: опыт и проблемы / А. И. Смолик, И. Б. Канапацкий ; Правл. о-ва «Знание» БССР. – Минск, 1989. – 21 с. – Библиогр.: с. 20–21 (9 назв.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1990**

***48.*** **Вучэбна-метадычны** дапаможнік па грамадазнаўстве. Ч. 1 / Мін. дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага ; [склад.: І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік, Л. Л. Шкуцько]. – Мінск, 1990. – 80 с.

**1991**

***49.*** **Совершенствование** форм и методов профессионального отбора и довузовской подготовки молодежи / А. И. Смолик // Актуальные проблемы психологии и педагогики довузовской подготовки : (материалы межвуз. конф.), [12–15 нояб. 1990 г.] / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1991. – С. 51–53.

***50.*** **Святло** далёкіх продкаў : [аб рабоце фак. даінстытуцкай падрыхт. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага па далучэнні навучэнцаў да нац. культуры] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1991. – 5 мая.

***51.*** **Толькі** сінтэз : [выклад. беларус. мовы і літ. на падрыхт. аддз. Мін. дзярж. пед. ін-та імя А. М. Горкага] / А. І. Смолік // Настаўн. газ. – 1991. – 30 кастр.

***52.*** **Основы** политологии : учеб.-метод. пособие / [среди авт. А. И. Смолик] ; Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1991. – 122 с.

***53.*** **Павышэнне** моўнай культуры і выхаванне нацыянальнай самасвядомасці моладзі : [метад. распрац.] / Мін. дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага ; [склад.: А. І. Смолік, А. М. Цясевіч, Г. М. Курыленка]. – Мінск, 1991. – 14 с.

***Рэдагаванне***

***54.*** **Актуальные** проблемы психологии и педагогики довузовской подготовки : (материалы межвуз. конф., [12–15 нояб. 1990 г.] / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького ; [ред.: П. И. Кибалко, А. И. Смолик]. – Минск, 1991. – 115 с.

**1992**

***55.*** **Фарміраванне** этнапсіхалогіі ў слухачоў факультэта даінстытуцкай падрыхтоўкі / А. І. Смолік // Даінстытуцкая падрыхтоўка моладзі і арыентацыя яе на педагагічныя прафесіі: вопыт і праблемы : (матэрыялы рэсп. [навук.-метад.] канф. [17–19 лістап., Мінск]) / Мін. дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага. – Мінск, 1992. – С. 69–72.

***56.*** **Асновы** паліталогіі : вучэб. дапам. Ч. 1 / [сярод аўт. А. І. Смолік] ; Мін. дзярж. пед. ін-т імя А.М. Горкага.– Мінск, 1992.– 136 с.

***Рэдагаванне***

***57.*** **Даінстытуцкая** падрыхтоўка моладзі і арыентацыя яе на педагагічныя прафесіі: вопыт і праблемы : (матэрыялы рэсп. [навук.-метад.] канф.), [17–19 лістап., Мінск] / Мін. дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага ; [рэд.: П. І. Кібалка, А. І. Смолік]. – Мінск, 1992. – 146 с.

**1993**

***58.*** **Дыпломныя** і курсавыя працы як сродак далучэння студэнтаў да нацыянальных традыцый / А. І. Смолік // Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў : зб. навук. арт. – Мінск, 1993. – С. 17–19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***59.*** **Практычныя** аспекты арганізацыі і функцыяніравання інстытута культуры ва ўмовах нацыянальнага адраджэння / А. І. Смолік // Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў : тэз. дакл. Міжнар. навук.-метад. канф. (18–19 крас. 1993 г.) : [у 2 ч.]. – Мінск, 1993. – Ч. 1. – С. 3–4.

***60.*** **Аляксандр** Смолік : «Штурмуйце» наш універсітэт : [размова з прарэктарам Беларус. ун-та культуры] / запісаў А. Градзюшка // Чырвоная змена. – 1993. – 4 лістап.

***61.*** **Сістэмы** дакладных ведаў у беларускай мове і мастацтве / [сярод аўт. А. Смолік] // Актуальныя праблемы беларускамоўнага выкладання тэхнічных і прыродазнаўчых дысцыплін у ВНУ : матэрыялы навук.-метад. канф., 4–5 мая 1993 г. / Мін. радыётэхн. ін-т. – Мінск, 1993. – С. 52–53.

***62.*** **Сістэмы** дакладных ведаў у мове, мастацтве і канструяванні / [сярод аўт. А. Смолік] // Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў : тэз. дакл. Міжнар. навук.-метад. канф. (18–19 крас. 1993 г.) : [у 2 ч.] / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1993. – Ч. 2. – С. 47–48.

***Рэдагаванне***

***63.*** **Нацыянальная** культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў : тэз. дакл. Міжнар. навук.-метад. канф. (18–19 крас. 1993 г.) : [у 2 ч.] / Беларус. ун-т культуры ; [гал. рэд. А. І. Смолік]. – Мінск, 1993. – Ч. 1. – 98 с. ; Ч. 2. – 120 с.

**1994**

***64.*** **Пераход** да сусветных тэхналогій і сістэм падрыхтоўкі культуралагічных кадраў: вынікі і праблемы / А. І. Смолік // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (1–2 лют. 1994 г.) / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – С. 4–5.

***65.*** **Мадэлі** ўкаранення элементаў інфармацыйных тэхналогій у навучальны працэс для мастацкіх спецыялізацый / [сярод аўт А. І. Смолік] // Актуальныя праблемы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (19–20 крас. 1994 г.) / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – С. 64 : схем.

***66.*** **Мадэлі** шматступеньчатай сістэмы падрыхтоўкі кадраў у Беларускім універсітэце культуры / [сярод аўт. А. І. Смолік] ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – 23 с.

### *Рэдагаванне*

***67.*** **Прафесіяналізм** выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (1–2 лют. 1994 г.) / Беларус. ун-т культуры ; [рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск, 1994. – 148 с.

## 1995

***68.*** **Гуманітарны** аспект інфармацыйнай культуры выпускніка ўніверсітэта / А. І. Смолік // Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (2–3 лют. 1995 г.) / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1995. – С. 3.

***69.*** **Палітычнае** жыццё на Беларусі ў першай палове 90-х гадоў : матэрыялы да камп’ютарнай праграмы / А. І. Смолік, А. Г. Зязюля ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1995. – 10 с. : іл. – Памылка ў перакладзе імя па бацьку А. Р. Зязюлі.

***70.*** **Сістэма** кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім (XIV–XVII стст.) : матэрыялы да камп’ютарнай праграмы / А. І. Смолік, А. Г. Зязюля ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1995. – 19 с. – Памылка ў перакладзе імя па бацьку А. Р. Зязюлі.

***71.*** **Органы** ўлады і кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім (XV–XVI стст.) / А. Смолік, С. Барыс // Беларус. гіст. часопіс. – 1995. – № 4. – С. 161–175 : іл. – Бібліягр. у канцы арт.

### *Рэдагаванне*

***72.*** **Праблемы** ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (2–3 лют.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1995 г.) / Беларус. ун-т культуры ; [рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск, 1995. – 96 с.

***73.*** **Дзямешка, Л. А.** Бібліятэка і вольны час : вучэб. дапам. / Л. А. Дзямешка ; [адк. за вып. А. І. Смолік] ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1995. – 75 с.

## 1996

***74.*** **Культура** Беларусі ў XIV–XVI стст. : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996.– 22 с. : схем. – Бібліягр.: с. 21 (5 назв.).

***75.*** **Рэферэндум** – форма непасрэднай дэмакратыі : матэрыял у дапамогу студ. / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – 33 с. + Дадат. – Бібліягр.: с. 15 (4 назв.).

***76.*** **Старажытнае** грамадства : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – 15 с.

***77.*** **Утварэнне** і лад старажытных княстваў : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – 30 с. : схем. – Бібліягр.: с. 29.

***78.*** **Асаблівасці** складвання татарскага шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім / А. І. Смолік // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі : да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы пры Вітаўце Вялікім : Другая Міжнар. навук.-практ. канф., Менск, 19–20 траўня 1995 г. : [у 2 ч.] / Рэсп. цэнтр нац. культур [і інш. – Мінск, 1996]. – Ч. 2. – С. 26–28.

***79.*** **На** чыю галаву снег? : [гутарка з прарэктарам па вучэбнай рабоце Беларус. ун-та культуры А. І. Смолікам пра аварыйную сітуацыю, што склалася ў інтэрнаце ўніверсітэта] / гутарыла Л. Цімошык // Звязда. – 1996. – 17 студз.

***80.*** **Дэмакратыя**, канстытуцыя, рэферэндум : матэрыял у дапамогу студ. і выкладчыкам / П. І. Бондар, П. Р. Ігнатовіч, А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – 33 с. – Бібліягр.: с. 32 (7 назв.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***81.*** **Сацыяльны** лад у Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVI стст. : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік, А. Р. Зязюля ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – 11 с. : схем. – Бібліягр.: с. 10.

***82.*** **Сацыяльная** структура грамадства ВКЛ (XV–XVI стст.) / А. Смолік, С. Барыс // Беларус. гіст. часопіс. – 1996. – № 3. – С. 98–107. – Бібліягр.: 14 назв.

***Рэдагаванне***

***83.*** **Развіццё** творчых здольнасцей студэнтаў: праблемы, пошукі, рашэнні : тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (1–2 лют. 1996 г.) / Беларус. ун-т культуры ; [рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск, 1996. – 62 с.

**1997**

***84.*** **Арганізацыя** вайсковай справы ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVII стагоддзі : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік. – Мінск, 1997. – 23 с. : іл. – Бібліягр.: с. 22 (10 назв.).

***85.*** **Выкарыстанне** камп'ютарнага комплексу пры вывучэнні гісторыі Беларусі : дапам. для студ. Ч. 1. / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1997. – 112 с. : іл. – Бібліягр. у канцы тэм.

***86.*** **Гісторыя** Беларусі XVI–XIX стагоддзяў : інфарм.-давед. матэрыялы да баз даных : вучэб. дапам. для студ. выш., навучэнцаў сярэд. спец. навуч. установаў культуры і мастацтва / А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 1997. – 236 с. : схем. – Бібліягр. у канцы тэм.

***87.*** **Эканамічнае** і грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў XVII стагоддзі : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1997. – 22 с. : іл. – Бібліягр.: с. 21.

***88.*** **Этнаканфесіянальная** структура ў Вялікім Княстве Літоўскім (XIV–XVI стст.) : матэрыялы да камп'ютарнай праграмы / А. І. Смолік ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1997. – 26 с. : іл. – Бібліягр.: с. 25 (10 назв.).

